ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце установы адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
__________ С.М.Фяклістава
06 __ чэрвеня ______ 2025 г.

**ВОДЗЫЎ**

апаніруючай арганізацыі
ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
на дысертацыю **Сацукевіча Івана Іванавіча**
"Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)",
прадстаўленую на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Дысертацыя І.І. Сацукевіча «Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)» уяўляе сабой цэласную, самастойную, кваліфікацыйную працу і адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне "Гістарычныя навукі".

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з адзнакай яго значнасці.**

Дысертацыя І.І. Сацукевіча ўяўляе сабой першае ў айчыннай гістарыяграфіі сістэмнае даследаванне ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг. Саіскальнікам была распрацавана методыка даследавання ўрбананіміі, якая базуецца на аналізе спосабаў, фактараў і прынцыпаў фарміравання ўрбананімнага ландшафту горада.

Дысертацыя І.І. Сацукевіча з'яўляецца самастойна выкананым навуковым даследаваннем, у якім раскрываецца паходжанне ўнутрыгарадскіх назваў Мінска: вуліц, плошчаў, прадмесцяў, мікрараёнаў і г.д. У дадзенай дысертацыі ўпершыню на падставе шырокага кола інфармацыі крыніц сістэмна аналізуецца працэс генезісу ўнутрыгарадскіх найменняў Мінска і паказваецца сувязь паміж урбанонімамі і сацыяльна-эканамічным, рэлігійным і палітычным развіццём Беларусі. Дысертантам раскрываюцца прычыны карэнных перамен ва ўрбананімным ландшафце Мінска ў 1793–1991 гг.; вызначана колькасць вуліц і

прадмесцяў Мінска і яе змяненні ў даследуемы перыяд; складзены табліцы масавых перайменаванняў, прасочаны змены назваў найважнейшых гарадскіх вуліц ад 1793 да 1991 г.; адноўлены і лакалізаваны дзясяткі страчаных у апошнія дзесяцігоддзі найменняў; створана аснова для адраджэння забытых назваў (у выглядзе комплекса назваў вуліц, плошчаў, мікрараёнаў, паркаў, станцый метро) на сучасным этапе развіцця горада.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук.**

У адпаведнасці з пп. 20–21 “Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў” Іван Іванавіч Сацукевіч заслугоўвае прысуджэння яму вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за наступныя навуковыя вынікі:

- выяўленне спосабаў фарміравання ўрбананімнага ландшафту Мінска ў 1793–1991 гг. – аўтаномнага, згодна з якім унутрыгарадскія назвы стыхійна прысвойваліся самімі гараджанамі (грамадствам), пасля чаго фіксаваліся ў пісьмовых крыніцах, і інстытуцыянальнага спосаба, сутнасць якога заключалася ў стварэнні ўрбанонімаў гарадскімі структурамі (дзяржавай), якія давалі гарадскому аб’екту юрыдычна замацаваную новую назву;
- вылучэнне ва ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. у залежнасці ад змен дзяржаўнай прыналежнасці горада і дзяржаўнай палітыкі, а таксама спосабу фарміравання ўрбананімнай прасторы чатырох этапаў: 1) 1793–1865 гг. (унутрыгарадскія назвы фарміраваліся з дапамогай аўтаномнага спосабу, калі само грамадства стыхійна давала найменні вуліцам, плошчам, урочышчам, прадмесцям); 2) 1866–1916 гг. (характарызаваўся панаваннем аўтаномнага і з’яўленнем інстытуцыянальнага спосабу); 3) 1917–1944 гг. (адыход ад аўтаномнага спосабу і ўдасканаленне інстытуцыянальнага); 4) 1945–1991 гг. (панаванне інстытуцыянальнага спосабу фарміравання ўрбананімнага ландшафту);
- доказ таго, што важнейшымі фактарамі фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. з’яўляліся сацыяльна-эканамічны і грамадска-палітычны, што адлюстравалася ў фарміраванні і трансфармацыі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска;
- выяўленне прынцыпаў фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг.: этна-рэлігійнага (назвы ўказвалі на культавыя ўстановы розных веравызнанняў і месцы рассялення этнасаў), тапаграфічнага (унутрыгарадскія назвы адлюстроўвалі асаблівасці ландшафту і мясцовую тапаграфію), геаграфічнага (урбанонімы фарміраваліся па геаграфічных аб’ектах), прафесійнага (урбанонімы ўказвалі на заняткі і прафесіі мінчан), геданімічнага (назвы былі прыгожымі па гучанні, але нічога не значылі па сутнасці), патранімічнага (прадугледжваў найменаванне аб’ектаў па імені або

прозвішчы чалавека), сімвалічнага (назвы адпавядалі ідэалогіі, якая праводзілася ў дзяржаве).

**Заўвагі па дысертацыі.**

У цэлым, станоўча ацэньваючы разглядаемую дысертацыю, неабходна выказаць пэўныя заўвагі, якія носяць пераважна рэкамендацыйны характар:

1. У "Агульнай характарыстыцы работы" (с. 8) геаграфічныя межы дысертацыйнага даследавання ўказваюць на тэрыторыю, якая суадносіцца з граніцамі Мінска па стане на 1991 г., што можа быць незразумела для тых, хто не арыентуецца ў геаграфіі сталіцы Рэспублікі Беларусь.

2. У раздзеле 1.2 "Крыніцы" (с. 23–24) аўтар прыводзіць пералік статыстычна-даведачных выданняў – "Справочная книжка на 1904 г.", "Весь Минск", "Минск в кармане. Справочная книжка. 1914 г.", "Уся БССР", "Справочник противопожарного водоснабжения улиц и переулков г. Минска", на якія няма спасылак. Таксама на с. 24 няма спасылак на справы ф. 120 і ф. 1447 Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Пры гэтым на матэрыялы з гэтых фондаў даследчык спасылаецца ў другой главе дысертацыі. На с. 24–25 адсутнічаюць спасылкі на перыядычныя выданні, пералік якіх таксама прыводзіцца ў раздзеле 1.2 "Крыніцы" – "Минские губернские ведомости", "Минский листок", "Северо-западный край", "Беларускі шлях", "Беларусь" і інш. Пры гэтым на некаторыя з пералічаных газет аўтар спасылаецца ў тэксце 2, 3, 4 глаў.

3. У раздзеле 1.3 "Метады даследавання" на с. 27 размешчана тлумачальная інфармацыя аб неабходнасці "выкарыстання паняційнага апарату анамастыкі" і тлумачэнне тэрміну "урбананімія", якую мэтазгодна было размясціць у раздзелах "Уводзіны" і "Тэрміны і азначэнні".

4. Наяўнасць у другой главе вялікай колькасці адсылак да сучасных назваў і месцы размяшчэння вуліц, плошчаў, завулкаў і г.д., якія існавалі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. перагружае тэкст главы і робіць яго цяжкім для ўспрымання. Мэтазгодна гэты матэрыял было б вынесці ў дадатак, як гэта было зроблена ў Дадатку Б, Дадатку В, Табліца В.1 і інш.

5. На с. 30 у тлумачэнні паходжання назвы вуліцы Семінарыйскай няма спасылкі на факт, што на гэтай вуліцы раней існавала ўніяцкая семінарыя. На с. 34 няма спасылкі на факт таго, што слова "магазін" у XIX ст. азначала правіянцкі склад.

6. Месцамі аўтар выкарыстоўвае публіцыстычны стыль у напісанні тэксту работы (с. 31 – "час ад часу", "назва вуліцы падказвае"; с. 40 – "губернатара М. Трубяцкога не бянтэжыла"; с. 91 – "злучыла закаханых на карце Мінска" і інш.).

7. На с. 36 дысертант адзначае, што "у красавіку 1865 г. у канцылярыі Віленскага ваеннага губернатара была заведзена справа…". Аднак з 1864 г.

падзел на ваенных і грамадзянскіх губернатараў быў ліквідаваны. Хутчэй за ўсё тут ідзе гаворка пра канцылярыю Віленскага, Гродзенскага, Ковенскага і Мінскага генерал-губернатара, галоўнага начальніка ў Віцебскай і Магілёўскай губернях.

8. У высновах па раздзеле 2.1 “Фактары фарміравання назваў вуліц і плошчаў” (с. 44–45) дысертант адзначае, што “адмена прыгоннага права, развіццё капіталістычных адносін і … прывялі да хуткай урбанізацыі і рэзкага росту колькасці ўнутрыгарадскіх назваў”, аднак у тэксце раздзела не адлюстраваны гэтыя працэсы і іх які-небудзь уплыў на з'яўленне або змяненне назваў вуліц і плошчаў.

9. На с. 46 аўтар тлумачыць тэрміны “слабада”, “урочышча” і “фальварак”, хоць у раздзеле “Тэрміны і азначэнні” іх тлумачэнні прысутнічаюць.

10. У высновах па раздзеле 2.2 “Умовы з’яўлення найменняў прадмесцяў, слабод, урочышчаў і фальваркаў” (с. 55) аўтар адзначае, што “Мінску былі патрэбны рабочыя рукі на фабрыках і заводах, таму на працягу XIX ст. імкліва расла колькасць слабод і прдмесцяў”, “Вялікі прастор гарадской зямлі ў XIX ст. актыўна ўключалі ў гаспадарчы зварот пад земляробства, што выклікала рост колькасці ўрочышчаў і фальваркаў”. Аднак у тэксце раздзела практычна адсутнічае сувязь працэсу назвы слабод, прадмесцяў, ўрочышчаў і інш. з палітычнымі і эканамічнымі з'явамі, якія працякалі ў гэты перыяд у рэгіёне.

11. Высновы па главе 2 “Стан унутрыгарадскіх назваў у 1793 –1916 гг.” (с. 55–56) цалкам паўтараюць высновы па раздзеле 2.1 “Фактары фарміравання назваў вуліц і плошчаў” (с. 44–45).

12. На с. 62 аўтар адзначае, што падчас польскай акупацыі “жыхары Мінска працягвалі карыстацца ў побыце старымі дарэвалюцыйнымі назвамі, бо працягласць існавання новых назваў была абмежавана дзевяццю месяцамі акупацыі”. На самой справе польская акупацыя доўжылася не 9, а 11 месяцаў (08.08.1919–10.07.1920).

13. На с. 85–88 аўтар адзначае, што ўрбанонімаў патранімічнага паходжання было 241, і далей дзеліць іх на групы з указаннем колькасці ў кожнай: 1) 67 (28%); 2) 61 (25%); 3) 34 (19 %); 4) 26 (11%); 5) 26 (11%); 6) 25 (10%). У выніку, у суме выходзіць 239 урбанонімаў замест 241, а сума працэнтных доляў складае 104 %.

14. На с. 88–89 аўтар адзначае, што “непатранімічных назваў налічваецца 142” і далей таксама дзеліць іх на групы з указаннем колькасці ў кожнай: 1) 73 (52%); 2) 32 (23%); 3) 21 (15%); 4) 9 (7%); 5) 6 (4%). У выніку, у суме выходзіць 141 урбанонім замест 142, а сума працэнтных доляў складае 101 %.

15. На с. 97–98, 100, 101, 103 аўтар выходзіць за храналагічныя межы даследавання. Напрыклад, на с. 100 “ Галоўная вуліца былога пасёлка

Заводская ў 1972 г. была перайменавана ў Піянерскую. У 2004 г. тут разгарнулі будаўніцтва катэджнага мік-на Радужны, а ў 2006 г. пачаўся знос старой забудовы".

15. На с. 101 даследчык адзначае, што "моцна пасунулася мяжа Мінска ў бок пашырэння ў 1978 г.", аднак адсутнічае тлумачэнне прычын гэтай з'явы.

16. Высновы па главе 4 "Унутрыгарадскія назвы Мінска ў 1945–1991 гг." (с.107–108) практычна цалкам ідэнтычны высновам па раздзелах 4.1 "Найменні гарадскіх вуліц і плошчаў ва ўмовах урбанізацыі" (с. 92–93) і 4.2 "Назвы рабочых пасёлкаў,мікрараёнаў, зялёных масіваў, былых вёсак і раёнаў у час актыўнага будаўніцтва і пашырэння адміністратыўных граніц" (с. 107).

Выказаныя заўвагі не мяняюць агульнай станоўчай ацэнкі дысертацыйнага даследавання і не зніжаюць яго навуковай і практычнай значнасці.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Навуковая кваліфікацыя аўтара дысертацыі І.І. Сацукевіча падцвярджаецца зместам дысертацыі і аўтарэферата, поўнасцю адпавядае кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук. Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым грунтоўным навуковым даследаваннем, праведзеным на сучасным узроўні. Работа грунтуецца на рэпрэзентатыўнай крыніцазнаўчай базе (справаводства, статыстычныя, картаграфічныя, перыядычныя выданні, мемуарная літаратура), выяўленай аўтарам у пяці архівах Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі, а таксама Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Бібліяграфічны спіс складае 406 пазіцый. Крыніцы інтэрпрэтаваны з выкарыстаннем разнастайных метадаў (гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і інш.) гістарычнага даследавання, што павялічвае верагоднасць атрыманых вынікаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 44 друкаваных працах агульным аб'ёмам 16 аўтарскіх аркушаў, у тым ліку 8 артыкулах у навуковых часопісах і зборніках, уключаных ВАК у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены на 18 навуковых канферэнцыях. Высновы абгрунтаваны, падцвярджаюцца дадзенымі даследавання, адпавядаюць пастаўленным мэце і задачам, утрымліваюць у сабе новую навуковую інфармацыю.

**Заключэнне.**

Кандыдацкая дысертацыя Сацукевіча Івана Іванавіча «Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)» з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, поўнасцю адпавядае патрабаванням пп. 20–21 "Палажэння аб прысуджэнні

вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь”. Яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

- выяўленне спосабаў фарміравання ўрбананімнага ландшафту Мінска ў 1793–1991 гг. – аўтаномнага, згодна з якім унутрыгарадскія назвы стыхійна прысвойваліся самімі гараджанамі (грамадствам), пасля чаго фіксаваліся ў пісьмовых крыніцах, і інстытуцыянальнага спосаба, сутнасць якога заключалася ў стварэнні ўрбанонімаў гарадскімі структурамі (дзяржавай), якія давалі гарадскому аб’екту юрыдычна замацаваную новую назву;
- вылучэнне ва ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. у залежнасці ад змен дзяржаўнай прыналежнасці горада і дзяржаўнай палітыкі, а таксама спосабу фарміравання ўрбананімнай прасторы чатырох этапаў: 1) 1793–1865 гг. (унутрыгарадскія назвы фарміраваліся з дапамогай аўтаномнага спосабу, калі само грамадства стыхійна давала найменні вуліцам, плошчам, урочышчам, прадмесцям); 2) 1866–1916 гг. (характарызаваўся панаваннем аўтаномнага і з’яўленнем інстытуцыянальнага спосабу); 3) 1917–1944 гг. (адыход ад аўтаномнага спосабу і ўдасканаленне інстытуцыянальнага); 4) 1945–1991 гг. (панаванне інстытуцыянальнага спосабу фарміравання ўрбананімнага ландшафту);
- доказ таго, што важнейшымі фактарамі фарміравання ўрбананіміі Мінска ў 1793–1991 гг. з’яўляліся сацыяльна-эканамічны і грамадска-палітычны, што адлюстравалася ў фарміраванні і трансфармацыі ўнутрыгарадскіх назваў Мінска;
- выяўленне прынцыпаў фарміравання ўнутрыгарадскіх назваў Мінска ў 1793–1991 гг.: этна-рэлігійнага (назвы ўказвалі на культавыя ўстановы розных веравызнанняў і месцы рассялення этнасаў), тапаграфічнага (унутрыгарадскія назвы адлюстроўвалі асаблівасці ландшафту і мясцовую тапаграфію), геаграфічнага (урбанонімы фарміраваліся па геаграфічных аб’ектах), прафесійнага (урбанонімы ўказвалі на заняткі і прафесіі мінчан), геданімічнага (назвы былі прыгожымі па гучанні, але нічога не значылі па сутнасці), патранімічнага (прадугледжваў найменаванне аб’ектаў па імені або прозвішчы чалавека), сімвалічнага (назвы адпавядалі ідэалогіі, якая праводзілася ў дзяржаве).

Водзыў на дысертацыю Сацукевіча Івана Іванавіча “Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)” разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні праблемнага савета па гістарычных навуках установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” 6 чэрвеня 2025 г. (пратакол № 4), праведзеным у адпаведнасці з загадам рэктара № 1108л ад 30.05.2025.

У працы праблемнага савета прынялі ўдзел 8 членаў, у тым ліку 2 доктара і 6 кандыдатаў гістарычных навук: доктар гістарычных навук, прафесар

А.П. Жытко, доктар гістарычных навук, дацэнт С.А. Талмачова; кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.П. Шупляк; кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.А. Йоцюс; кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Ф. Рацько; кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.В. Ефімовіч; кандыдат гістарычных навук І.В. Пугач; кандыдат гістарычных навук, дацэнт І.М. Трасцян.

Саіскальнік выступіў з дакладам, у якім абгрунтаваў актуальнасць тэмы дысертацыі, асвятліў гістарыяграфію праблемы і выкарыстаныя крыніцы, агучыў мэту і задачы даследавання, выклаў палажэнні, якія выносяцца на абарону, і прадставіў асноўныя высновы, атрыманыя ў ходзе даследавання.

У ходзе дыскусіі Сацукевіч І.І. адказаў на пастаўленыя пытанні.

Эксперт кандыдат гістарычных навук, дацэнт Трасцян Ірына Мікалаеўна прадставіла водзыў на дысертацыю Сацукевіча Івана Іванавіча.

У галасаванні прыняло ўдзел 7 супрацоўнікаў гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт І.М. Трасцян не з'яўляецца членам праблемнага савета па гістарычных навуках, таму ўдзел у галасаванні не прымала.

Вынікі адкрытага галасавання: “за” – 7, “супраць” – няма, “устрымаліся” – няма.

Старшыня праблемнага савета,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дэкан гістарычнага факультэта — С.П.Шупляк

Эксперт апаніруючай арганізацыі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і
славянскіх народаў — І.М.Трасцян

Сакратар праблемнага савета,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных
дысцыплін — А.В.Ефімовіч

06.06.2025